III НЯДЗЕЛЯ ВЯЛІКАГА ПОСТУ

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
24.03.2019 00:00



З Евангелля св. Лукі

У той час прыйшлі некаторыя і расказалі Езусу пра галілеян, кроў якіх Пілат змяшаў з іх ахвярамі. Езус адказаў ім на гэта: “Думаеце, што гэтыя галілеяне былі большымі грэшнікамі за ўсіх галілеян, бо так пацярпелі? Не. Кажу вам, але калі не пакаецеся, усе таксама загінеце. Думаеце, што тыя васемнаццаць, на якіх звалілася сілаамская вежа і забіла іх, былі больш вінаватыя за ўсіх людзей, якія жылі ў Іерусаліме? Не. Але кажу вам, калі не пакаецеся, усе таксама загінеце”. І расказаў вось якую прыпавесць: “Адзін чалавек меў у вінаградніку сваім пасаджаную смакоўніцу і прыйшоў шукаць плоду на ёй, і не знайшоў. І сказаў вінаградару: «Вось я трэці год прыходжу шукаць плоду на гэтай смакоўніцы, і не знаходжу. Ссячы яе. Навошта яна займае зямлю?». Але той сказаў яму ў адказ: «Пане, пакінь яе на гэты год. Я абкапаю яе і абкладу ўгнаеннем. Можа, прынясе плод у будучым, а калі не, ссячэш яе»”. † *Лк 13, 1–9*

Прынясём плён

Чалавека можна параўнаць са смакоўніцай, за якой Езус як клапатлівы і цярплівы Садоўнік даглядае асабіста. Грэх прыводзіць да таго, што асоба губляе здольнасць прымаць службу Хрыста. Без ласкі Найвышэйшага мы можам жыць у дастатку і спакоі, але марна. Становімся тады падобнымі на дрэва, якое не прыносіць плод. Як ведаем з Евангелля, такую расліну ссякаюць і выкідваюць з саду.

Прыняцце прысутнасці Бога і Яго дзеяння здзяйсняецца на шляху навяртання. Касцёл ахвяруе для гэтага цудоўны інструмент – сакрамант пакаяння і паяднання, які можна акрэсліць як месца, адзначанае прысутнасцю і дзеяннем Усемагутнага. Пан запрашае кожнага прыняць Яго паслугу. Няхай канфесіянал стане для нас Святой Зямлёй. Давайце ўваходзіць туды як мага часцей, каб Збаўца вывеў нас з няволі граху, каб напоўніў жыццё добрымі пладамі: святасцю, любоўю, Сабой...

- Як я выконваю тую прашчу, якую, каб Бог мог зрабіць мае сэрцы мяккімі, перамяніў яго?